# Перадача нясвіжскай манетна-медальнай калекцыі Харкаўскаму ўніверсітэту (з архіўных дакументаў)

Ганна БЫЛЬ



Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», галоўны захавальнік фондаў, Рэспубліка Беларусь, г. Нясвіж, e-mail: ganyssa@rambler.ru

Ваенная кампанія 1812 г. паклала канец існаванню адной з самых вялікіх нумізматычных калекцый Беларусі, якая фарміравалася ў Нясвіжы пачынаючы з сярэдзіны XVI ст. знакамітым магнацкім родам Радзівілаў і дала пачатак фарміраванню мюнцкабінета пры Харкаўскім універсітэце. Працэс размеркавання і перадачы гэтай калекцыі пасля вайны 1812 г. дае магчымасць уявіць, як склаўся яе лёс.

Падчас працы з архіўнымі дакументамі была выяўлена справа пад назвай «Дело по представлению правления Харьковского университета, касательно отправленных в университет главнокомандующим Западною армиею адмиралом Чичаговым отбитых у неприятеля медалей и монет, забранных из замка князя Радзивила в Несвиже» [8]. Справа ўяўляе сабой перапіску паміж Імператарскім Харкаўскім універсітэтам, Міністэрствам народнай асветы і Ваенным міністэрствам наконт перадачы Валынскай казённай палатай універсітэту нясвіжскай манетна-медальнай калекцыі.

Калекцыя была вывезена з Нясвіжскага замка Радзівілаў пасля 30 кастрычніка 1812 г. па загадзе генерала П.В. Чычагава, які стварыў з вышэйшых афіцэраў камісію і загадаў забраць усе скарбы ў якасці ваенных трафеяў [10, с. 47]. У сваім лісце да імператара Аляксандра I ад 7 лістапада 1812 г. ён адзначаў:

*«...Чтобы несколько отомстить, я позволил порыться в некоторых погребах его* (кн. Доминик Радзивилл) *дома; там нашли сокровища: жемчуг, брилианты и пр. Я увез что мог, это будет сложено в Бобруйске или в другом месте, дабы Ваше Величество изволили решить, что с этим делать. Я ничего не видал, но говорят, что есть вещи достойные музеев»* [7, с. 50].

У выніку нясвіжская калекцыя манет і медалёў трапіла ў Мінск пасля 16 лістапада 1812 г. разам з іншымі скарбамі Радзівілаў, калі генерал П.В. Чычагаў заняў горад. У Мінску быў складзены рэестр[1] калекцыі, які генерал-інтэндант В.С. Рахманаў выслаў адміралу П.В. Чычагаву. 9 студзеня 1813 г. П.В. Чычагаў аддаў загад № 284 В.С. Рахманаву:

*«Из числа добычей взятых вверенною мне Армиею от неприятеля в Несвиже, находящихся ныне в Минске, предписываю Вашему Превосходительству 1) древние медали и монеты, коим вы доставили мне реестр, отправить в Харьковский университет, в который прилагается при сем и мое отношение»* [1, с. 58].

Харкаўскі ўніверсітэт быў заснаваны ў 1805 г. першым папячыцелем Харкаўскай вучэбнай акругі С.І. Патоцкім падчас адукацыйнай рэформы Аляксан-



*Павел Васільевіч Чычагаў (1767–1849)*

[1] *Рэестр – вопіс асобных калекцый, складзеных звычайна па прадметах або ў іншым прадметна-тэматычным вылучэнні.*




*Імператарскі Харкаўскі ўніверсітэт (1805–1917)*

дра І. Рэформа прадугледжвала стварэнне шасці вучэбных акруг, цэнтрамі якіх з'яўляліся імператарскія ўніверсітэты з улікам таго, што ў трох з іх установы ўжо існавалі (Маскоўскі, Віленскі, Дэрптскі), у адрозненне ад Харкава, Казані і Санкт-Пецярбурга. Згодна са Статутам, падпарадкоўваліся ўніверсітэты Міністэрству народнай асветы [5, с. 215–290]. Кіраваліся Праўленнем, у склад якога ўваходзіў рэктар – старшыня Праўлення, дэканы факультэтаў – члены Праўлення, а таксама *«непременный заседатель»*[2] [5, с. 267–268].

Папячыцель Харкаўскай вучэбнай акругі з 1803 г. па 1815 г., прадстаўнік Галоўнага праўлення вучылішчаў С.І. Патоцкі клапаціўся аб фарміраванні кабінетаў і збораў пры Харкаўскім універсітэце, якім рабіў шчодрыя ахвяраванні. У 1806 г. граф С.І. Патоцкі перадаў у дар універсітэту каля 800 экзэмпляраў манет розных дзяржаў, якія сталі пачаткам фарміравання мюнцкабінета [12, с. 38]. Традыцыя стварэння музейных збораў-кабінетаў пры навучальных установах для выкарыстання іх у працэсе навучання студэнтаў, гімназістаў, школьнікаў з'явілася яшчэ ў другой палове – канцы XVIII ст. [3, с. 45]. Так, напрыклад, у Імператарскім Маскоўскім універсітэце (1755 г.) у мюнцкабінеце, заснаваным у сярэдзіне XVIII ст., у 1826 г. налічвалася 3 731 экзэмпляр манет і медалёў, у мюнцкабінеце Імператарскага Віленскага ўніверсітэта (1803 г.) перад закрыццём у 1832 г. налічвалася 4 128 адзінак захоўвання [3, с. 44]. У Імператарскім Казанскім універсітэце (1804 г.) мюнцкабінет, заснаваны ў 1819 г., на 1832 г. налічваў каля 10 000 экзэмпляраў манет і медалёў [2, с. 2].

У сваім *«отношении»* да Харкаўскага ўніверсітэта ад 30 студзеня 1813 г. адмірал П.В. Чычагаў паведамляў наступнае:

*«Желая учавствовать в доставлении Харьковскому университету вещей замечания достойных, посылаю присем значительное собрание древних медалей и монет, взятых в добычу у неприятеля; покорнейше прошу принять их в знак моего уважения к отличному сословию просвещением юношества занимающемуся.*

*Приятно мне будет, когда збор сих медалей и монет окажется достойным внимания любителей древности и послужит в пользу благородному юношеству»* [8, с. 2].

Такім чынам, генерал П.В. Чычагаў вырашыў не толькі лёс калекцыі, але і падтрымаў фарміраванне мюнцкабінета ва ўніверсітэце.

Генерал В.С. Рахманаў у сваю чаргу 9 лютага склаў тлумачальную запіску да ліста П.В. Чычагава [8, с. 3] і аддаў распараджэнне тытулярнаму саветніку Касторскаму перадаць нясвіжскую манетна-медальную калекцыю Радзівілаў у Харкаўскі ўніверсітэт. Але калекцыя да ўніверсітэта не даехала, у сакавіку 1813 г. яна трапіла ў Валынскую казённую палату ў г. Жытоміры.

Пад кіраўніцтвам адмірала П.В. Чычагава і генерала В.С. Рахманава, як было пазначана ў квітанцыі Валынскай казённай палаты [8, с. 7–10 адв.], збор быў перададзены генерал-інтэндантам чыноўнікам 9-га класа Касторскім валынскаму губернатару М.І. Камбурлею. У сакавіку 1813 г. Касторскаму была выдадзена квітанцыя, у якой пазначалася, што нясвіжская манетна-медальная калекцыя трапіла ў казённую палату ў двух куфрах пад нумарамі 9 і 10. У прысутнасці камісіі, у склад якой увайшлі губернатар, віцэ-губернатар, губернскі пракурор, члены казённай палаты, два члены губернскага казначэйства і чыноўнік Касторскі, куфры былі ўскрыты і быў складзены падрабязны вопіс кожнага з іх. У куфры пад нумарам 9 знаходзілася 7 414 экзэмпляраў залатых, пазалочаных, срэбных, алавяных, медных манет і медалёў, а таксама 1 каменны і 1 драўляны медаль. У куфры пад нумарам 10 налічвалася 5 095 экзэмпляраў манет і медалёў, у асобную групу былі выдзелены новыя саксонскія манеты. У выніку агульная колькасць нясвіжскай манетна-медальнай калекцыі на 17–18 сакавіка 1813 г. склала 12 509 экзэмпляраў. Пасля апісання куфры ў прысутнасці камісіі былі апячатаны і перададзены для захоўвання на губернскі склад.

Такім чынам, нясвіжскі манетна-медальны збор Радзівілаў, які павінен быў трапіць у Харкаўскі ўніверсітэт, апынуўся ў сталіцы Валынскай губерні, дзе захоўваўся на губернскім складзе амаль паўгода. Ні адмірал П.В. Чычагаў, ні генерал В.С. Рахманаў не папярэдзілі аб гэтым універсітэт.

*«Отношение»* адмірала П.В. Чычагава і ліст генерала В.С. Рахманава былі разгледжаны Праўленнем Харкаўскага ўніверсітэта толькі 21 красавіка 1813 г. у сувязі з тым, што генерал В.С. Рахманаў *«при отношении своем от 9 апреля сего года препроводил в Харьковский университет отношение главнокомандуещего Западной Армией Г. адмирала Чичагова»* [8, с. 5]. Магчыма, генерал адправіў лісты роўна праз два месяцы пасля складання тлумачальнай запіскі з разлікам, што нясвіжская манетна-медальная калекцыя ўжо трапіла ва ўніверсітэт, але, на жаль, манетна-медальны збор не даехаў.

Передача калекцыі зацягнулася не толькі ў сувязі з яе знаходжаннем у Валынскай казённай палаце, але і з прычыны суда над рэктарам Харкаўскага ўніверсітэта. У красавіку 1813 г. Міністэрствам народнай асветы была заведзена справа на падставе абвінавачвання ад'юнктам Е.А. Васільевым рэктара А.І. Стайковіча, якая пачалася яшчэ ўвосень 1812 г. ва ўніверсітэце [9].

[2] *«Непременный заседатель», згодна са Статутам, прызначаўся папячыцелем з ардынарных прафесараў, з'яўляўся найбліжэйшым памочнікам рэктара ў Праўленні і ва ўніверсітэцкім судзе, наводзіў парадак у бягучых справах, вёў кантроль над выкананнем законаў і пастаноў.*

Е.А. Васільеў папракаў рэктара ў нездавальняючым стане ўніверсітэта, нядобрасумленным стаўленні да службы, а таксама ў забароненым гандлі віном і іншымі рэчамі. У ходзе справы былі выяўлены гандлёвыя спекуляцыі А.І. Стайковіча, які без пошліны ўвозіў замежныя тавары: венгерскае віно, эстампы (графічны твор мастацтва, зроблены спосабам друкавага адбітка), гранаты (жаночыя каралі), ленты (жаночыя ўпрыгажэнні?) і карціны. Адсутнасць мытных штампаў на рэчах сведчыла аб іх незаконным імпарце ў краіну, што падрывала казну Расійскай Імперыі.

Праўленне ўніверсітэта спрабавала самастойна вырашыць пытанне, стварыўшы *«Праўленне для суда»* па справе рэктара пад кіраўніцтвам прафесара І.Е. Срэзнеўскага. У выніку ў красавіку 1813 г. у прысутнасці членаў Савета ўніверсітэта было аб'яўлена аб спыненні справы па пагадненні бакоў без далейшых наступстваў, але былі тыя, хто не пагадзіўся з рашэннем Савета, спасылаючыся на тое, што справа, якая цягнулася амаль паўгода, можа падарваць аўтарытэт універсітэта і прывесці да страты павагі і даверу з боку насельніцтва.

Такім чынам, згодна з пастановай Праўлення, было вырашана напісаць ліст міністру народнай асветы А.К. Разумоўскаму, які 21 мая 1813 г. загадаў Праўленню ўніверсітэта выбраць новага рэктара з ліку ардынарных прафесараў, а прафесара А.І. Стайковіча тым часам адправіў у адпачынак «па хваробе» на тры месяцы. 26 чэрвеня прарэктарам быў выбраны *«непременный заседатель»* Ц.Ф. Асіпоўскі, а 8 жніўня зацверджаны міністрам як рэктар [4, с. 35].

З 28 чэрвеня 1813 г. пачалася перапіска паміж Харкаўскім універсітэтам ад імя прарэктара Ц.Ф. Асіпоўскага [8, с. 1], міністрам народнай асветы А.К. Разумоўскім і ваенным міністрам А.І. Гарчаковым, звязаная з пошукам, перадачай і дастаўкай нясвіжскай калекцыі ў Харкаў [8, с. 4–13 адв.].

Дзякуючы А.К. Разумоўскаму, які даведаўся ад ваеннага міністра А.І. Гарчакова, што манетна-медальны збор быў здадзены для захоўвання ў Валынскую казённую палату [8, с. 6], калекцыя ў выніку трапіла ў Харкаў. Апошняй кропкай у гэтай справе стаў ліст А.К. Разумоўскага ад 20 жніўня валынскаму губернатару М.І. Камбурлею, у якім было адзначана:

*«Г. Генерал интендант Западной армии Рахманов препроводил в Харьковский университет прилагаемое при сем отношение Главнокомандующего сего армиею Г. адмирала Чичагова, с изъяснением, что он отправляет в университет значительное собрание древних медалей и монет, взятых в добычу у неприятеля. По сношении моему с Управляющим военным Министерством князем Алексеем Ивановичем Горчаковым оказалось, что медали и монеты отправленные с чиновником 9-го класса Касторским, сданы им для хранения в Волынскую казенную палату. По сему покорнейше прошу Ваше Превосходительство предложить Палате, дабы она все упомянутые монеты и медали по принадлежанию препроводила в Харьковский университет. ... употрибиться на тамошнею пересылку издержки без замедления возвращены будут палате от университета, потому о том удается сделать предписание»* [8, с. 11–11 адв.].

Акрамя гэтага, А.К. Разумоўскі папярэдзіў Праўленне Харкаўскага ўніверсітэта аб выплаце за перасылку Валынскай казённай палаце і аб складанні вопісу манет і медалёў, копію якога павінны пераслаць яму ў хуткім часе [8, с. 12–12 адв.].

У выніку 27 верасня 1813 г. нясвіжская манетна-медальная калекцыя Радзівілаў у двух куфрах пад нумарамі 9 і 10 трапіла ва ўніверсітэт згодна з указам валынскага губернатара М.І. Камбурлея праз чыноўніка тытулярнага саветніка Грабоўскага і каштавала гэта Праўленню ўніверсітэта 179 р. 40 к. [8, с. 13–13 адв.]. Быў складзены вопіс калекцыі, у якім адзначалася 12 926 экзэмпляраў манет і медалёў рознага металу [8, с. 16]. *«Перечневый спис»* быў разгледжаны 2 снежня 1813 г. на пасяджэнні Галоўнага праўлення вучылішчаў па прапанове міністра народнай асветы А.К. Разумоўскага [8, с. 15, 17], у выніку чаго вопіс вырашылі надрукаваць у часопісе Міністэрства народнай асветы «Периодическое сочинение об успехах народного просвещения» [6, с. 280–281]. Вопіс утрымлівае падрабязны пералік манет і медалёў з пазнакай матэрыялу іх вырабу (золата, срэбра, медзь і г. д.). Адметна, што агульную колькасць прадметаў складзенага вопісу вызначылі ў 12 926 адзінак, але калі скласці ўсе катэгорыі пералічаных у ім прадметаў, атрымліваецца лічба 13 226. Чым выклікана такое разыходжанне ў адным дакуменце, сказаць цяжка.


280 РАЗНЫЯ

щане: Рудаковъ, Кузнецовъ, Хавринъ по 25 р. мѣщанинъ Карышевъ 20 р. Коллежскіе Секретари: Карсаковъ, Ошурковъ и Губернскій Секретарь Дудкинъ по 15 р. Протоіерей Радіоновъ, Коллежскій Ассессоръ Семеновъ, Штабъ Лѣкарь Петровъ; купцы Григорій и Петръ Неволины по 10 р. Соляной приставъ Алешинъ, Дистаночный начальникъ Главинскій, учитель Устюжаниновъ, купцы: Бушаковъ, Пятидесятниковъ, Кожинъ, мѣщане: Демидовъ и Сцакинъ по 5 рублей.

По представленію Попечителя Московскаго Университета, Адъюнктъ сего Университета Данилевскій утвержденъ въ званіи Екстраординарнаго Профессора.

На праздныя учительскія мѣста въ нижеозначенныя уѣздныя училища по Харьковскому Округу опредѣлены Студенты Санктпетербургскаго Педагогическаго Института: Лопушевскій въ Херсонское, Стефановскій въ Феодосійское, Александръ Смирновъ въ Алешковское, Шаржинскій въ Орѣховское, Гиляровъ въ Симферопольское и Михайло Смирновъ въ Новомиргородское училище.

*Въ Декабрѣ.*

Г. Адмиралъ Чичаговъ во время командованія его 2ю Западною арміею, взявъ въ добычу у непріятеля собраніе разныхъ древнихъ монетъ и медалей, препроводилъ оное

ИЗВѢСТІЯ. 281

въ Харьковскій Университетъ. Собраніе сіе состоитъ изъ 12,926 медалей и монетъ различнаго металла. Изъ монетъ и медалей золотыхъ 239; монетъ и медалей золотыхъ и позолоченныхъ 259; медалей и монетъ золотыхъ позолоченыхъ, серебреныхъ и мѣдныхъ 63; медалей и монетъ серебреныхъ 6589; медалей и монетъ серебреныхъ и разныхъ металловъ кромѣ золота 5385; новой Саксонской монеты 36; монетъ и медалей мѣдныхъ 639; медалей оловянныхъ 64; медали каменной 1; медали деревяной 1; всего 12,926 штукъ.

Совѣтъ Харьковскаго Университета, въ знакъ признательности своей къ Г. Адмиралу Павлу Васильевичу Чичагову, приславшему въ упомянутый Университетъ означенное собраніе отбитыхъ у непріятеля монетъ и медалей, избралъ его Г. Адмирала въ Почетные Члены Университета. Выборъ сей утвержденъ Г. Министромъ.

Города Чембара городской глава купецъ Макарцовъ изъ ревности къ пользѣ сограждaнъ своихъ въ Мартѣ мѣсяцѣ 1811 года пожертвовалъ навсегда для имѣющаго быть въ Чембарѣ Уѣзднаго Училища на выстройку дома принадлежащее ему въ семъ городѣ усадебное мѣсто и сверхъ того деньгами 1500 рублей; подражая ему и прочіе купцы и мѣ-

*Периодическое сочинение об успехах народного просвещения*

6 лістапада 1813 г. А.К. Разумоўскі накіраваў ліст адміралу П.В. Чычагаву аб атрыманні ўніверсітэтам калекцыі:

*«Я считаю долгом свидетельствовать вам М.Г. мой, признательность мою за усердие ваше к сему университету, который обязан Вам приобретением редкого и полезного кабинета, украшением ему служашего» [8, с. 14].*

У сувязі з гэтым у снежні 1814 г. у знак удзячнасці П.В. Чычагаву быў прысвоены тытул Ганаровага члена Харкаўскага ўніверсітэта:

*«Совет Харьковского Университета, в знак признательности своей к Г. Адмиралу Павлу Васильевичу Чичагову, приславшему в упомянутый Университет означенное собрание отбитых у неприятеля монет и медалей, избрал его Г. Адмирала в Почетные Члены Университета. Выбор сей утвержден Г. Министром»* [6, с. 281].

Трэба адзначыць, што згодна са Статутам універсітэта Савет імкнуўся выбіраць у ганаровыя члены замежных вучоных, якія вялі перапіску, выконвалі розныя даручэнні, а таксама займаліся пошукам новых навуковых звестак. Раз на год універсітэт плаціў пенсію ганаровым членам, якая складала 200 р. [5, с. 237–238]. Пасля адхілення ад камандавання войскамі «па хваробе» 3 лютага 1813 г. і атрымання бестэрміновага замежнага адпачынку з захаваннем утрымання 25 лютага 1814 г. П.В. Чычагаў пакінуў Расію і больш не вяртаўся, правёўшы сваю другую палову жыцця ў Парыжы. Ці падтрымліваў сувязь П.В. Чычагаў з Харкаўскім універсітэтам, знаходзячыся ў Францыі, пакуль невядома.

Такім чынам, лёс нясвіжскай манетна-медальнай калекцыі Радзівілаў быў вызначаны адміралам П.В. Чычагавым у лістападзе – снежні 1812 г. падчас яе знаходжання ў Мінску. Колькасны склад старажытных манет і медалёў у нясвіжскім зборы пры падліках Валынскай казённай палатай у сакавіку 1813 г. склаў 12 509 экзэмпляраў, а ў кастрычніку 1813 г., пасля складання вопісу Харкаўскім універсітэтам, – 12 926 экзэмпляраў. Для параўнання, самымі вялікімі манетна-медальнымі зборамі ў Расійскай Імперыі на пачатак XIX ст. з'яўляліся мюнцкабінет Кунсткамеры (1714 г.), які на 1742 г. налічваў каля 29 000 манет і медалёў, і мюнцкабінет Эрмітажа, які ў 1803–1804 гг. складаўся з больш чым 15 000 экзэмпляраў манет і медалёў [11, с. 134]. Што тычыцца перадачы і дастаўкі манетна-медальнага збору з Нясвіжскага замка ў Харкаўскі ўніверсітэт, то працэс зацягнуўся амаль на год, у сувязі з доўгім захоўваннем у Валынскай казённай палаце.

Дакладнае размеркаванне і перадача нясвіжскай манетна-медальнай калекцыі Радзівілаў у Імператарскі Харкаўскі ўніверсітэт пры падтрымцы Міністэрства народнай асветы і Ваеннага міністэрства з'яўляецца яскравым прыкладам лёсу збору. Як адзначаў у сваім артыкуле С. Рыбчонак, астатнія рэчы з Нясвіжскага скарбу былі таксама размеркаваны паміж рознымі сховішчамі Расійскай Імперыі, большая частка якіх у выніку апынулася ў Эрмітажы, царкоўныя рэчы – у Маскоўскім саборы, а нешта наогул было прададзена на аўкцыёнах [10, с. 49]. Да сёння няма поўнай яснасці пра дакладнае размеркаванне рэчаў з Нясвіжскага скарбу пасля 1812 г. і адпаведна пра магчымае іх месцазнаходжанне.

***Бібліяграфічны спіс:***

1. *Апухтин, В.Р. Сердце России первопрестольная столица Москва и Московская губерния в Отечественную войну: А[лександр] I 1812 – Н[иколай] II 1912: очерк и архивные материалы / В.Р. Апухтин. – М.: Типография В.И. Воронова, 1912. – 60 с.*
2. *Березин, И.Н. Нумизматический кабинет Казанского университета / И.Н. Березин // Журнал М-ва народн. просв. – СПб.: Типография Имп. Акад. наук, 1855. – № 87. – С. 1–20.*
3. *Грималаускайте, Д. Истоки нумизматического собрания Виленского императорского университета (1803–1832) / Д. Грималаускайте // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. Вып. 4 / рэдкал.: С.М. Ходзін (адк. рэдактар) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 44–49.*
4. *Лавровский, Н.А. Эпизод из истории Харьковского университета / Н.А. Лавровский. – М.: Типография Моск. ун-та, 1873. – С. 58.*
5. *Периодическое сочинение о успехах народного просвещения. – СПб.: Типография Имп. Акад. наук, 1805. – № 10. – С. 215–290.*
6. *Периодическое сочинение о успехах народного просвещения. – СПб.: Типография Имп. Акад. наук, 1814. – № 38. – С. 280–281.*
7. *Письма адмирала Чичагова к Императору Александру I. Сообщено М.И. Богдановичем // Сб. Имп. Русск. Исторического Об-ва. – Т. 6. – СПб.: Типография Имп. Акад. наук, 1871. – С. 1–66.*
8. *Российский государственный исторический архив. – Ф. 733. Оп. 49. Д. 191. – Дело о доставлении в Харьковский университет главнокомандующим Западной армии адмиралом П.В. Чичаговым коллекции древних монет и медалей, захваченных в качестве трофеев у неприятеля.*
9. *Российский государственный исторический архив. – Ф. 733. Оп. 49. Д. 192. – Дело по обвинению адъюнктом Е.А. Васильевым ректора Харьковского университета А.И. Стойковича в неудовлетворительном состоянии университета, недобросовестном отношении к службе и запрещенной торговле вином и другими предметами.*
10. *Рыбчонак, С. Лёс Радзівілаўскіх скарбаў: «скарбец трох каралёў» / С. Рыбчонак // Герольд Litherland: навуковы геральдычны часопіс. – Гродна; Мінск. – 2019. – № 21. – С. 35–52.*
11. *Спасский, И.Г. Нумизматика в Эрмитаже. Очерк истории Минцкабинета – Отдела нумизматики / И.Г. Спасский // Нумизматика и эпиграфика. – М.: Наука, 1970. – Т. 8. – С. 123–234.*
12. *Фойгт, К.К. Историко-статистические записки об Императорском Харьковском университете и его заведениях от основания Университета до 1859 года // К.К. Фойгт. – Харьков: Университетская типография, 1859. – 172 с.*

## Handing over Nyasvizh Collection of Coins and Medals to Kharkiv University (from Archival Documents)

**Hanna Byl**, *Chief Custodian, State Establishment «National Historical and Cultural Museum-Reserve «Nyasvizh»», Minsk, Republic of Belarus, e-mail: ganyssa@rambler.ru.*

**Abstract.** *The article tracks, based on the archival documents, the history of Nyasvizh collection of coins and medals after the war of 1812. The quantitative composition of the collection is determined, as well as the place of its safekeeping after robbery of the castle. The role of General P.V. Chychagava in assigning and handing over collection of coins and medals to Kharkiv University is disclosed.*